# Яе вялікасць Кніга

**Насычаная праграма чакае наведвальнікаў XIX Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу, якая ўчора адкрылася ў сталіцы ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БЕЛЭКСПА» і будзе працаваць да нядзелі.**

Дарэчы, сёлета міжнародная кніжная выстава мае асабісты статус, паколькі праводзіцца ў рамках Года кнігі. Напярэдадні яго адкрыла цырымонія ўзнагароджання пераможцаў 51-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі». Конкурс прадставіў лепшыя беларускія кнігі як узор сапраўдных духоўных каштоўнасцей, здабытак нацыянальнай культуры.

Так, Гран-пры ў намінацыі «Трыумф» дастаўся выдавецтву «Беларуская Энцыклапедыя імя П.Броўкі» за кнігу «Дмитрий Струков. Альбом рисунков. 1864—1867». Пераможца атрымаў дыплом імя Францыска Скарыны і памятны знак-сімвал «Вялікі залаты фаліянт».

У намінацыі «Падручнік новага стагоддзя» дыплом трыумфатара атрымала выдавецтва «Вышэйшая школа» за навучальны дапаможнік з камплектам пропісей І.Боблы і інш. «Буквар-2». Дыпломам першай ступені ўзнагароджана выдавецтва «Народная асвета» за камплект кніг «Твоя столица».

Лепшай дзіцячай кнігай у намінацыі «Разам з кнігай мы расцём» прызнана кніга Н.Голубевай «Сказки тетушки Руфь» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і Мастацтва».

→ 2

# Яе вялікасць Кніга

1 Дыплом першай ступені атрымала выдавецтва Свята-Елісавецінскага жаночага манастыра ў Мінску за зборнік казак «Сказки из волшебного сундучка», дыплом другой ступені — выдавецтва «Мастацкая літаратура» за кнігу «Беларускія народныя казкі».

Перамогу ў намінацыі «Залатыя скрыжалі» (даведачныя і энцыклапедычныя выданні) атрымала выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя П.Броўкі» за энцыклапедыю «Максім Багдановіч». Беларускі фонд культуры за выданне кнігі Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» стаў лепшым у намінацыі «За ўклад у захаванне духоўнай спадчыны». Узнагароду за вялікі ўклад у прапаганду беларускай кнігі, падтрымку і развіццё чытання атрымала Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

Як адзначыў падчас адкрыцця XIX Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу міністр інфармацыі Беларусі Алег Праляскоўскі, на перамогу ў 51-м Нацыянальным конкурсе «Мастацтва кнігі» прэтэндавала 190 выданняў. Усе яны прадстаўлены на кірмашы, а таксама болей за 600 замежных экспанентаў.

— Нам давядзецца правесці вялікую работу па прапагандзе, папулярызацыі чытання, — дадаў міністр. — Мы ўскладаем вялікія надзеі як на беларускіх, так і замежных удзельнікаў кірмашу, агульныя намаганні якіх у выніку свабоднага абмену ідэямі, ведамі, вопытам будуць садзейнічаць інтэлектуальнаму прагрэсу, развіццю ўзаемаразумення і ўзаемаадносін паміж краінамі. Сёння на выставе прадстаўлена кніжная прадукцыя 20 краін свету. Па традыцыі ўдзел у кірмашы прымае ганаровы госць — сёлета ім стала Баліварыянская Рэспубліка Венесуэла. Таксама ў нас з'явіўся яшчэ адзін госць — Арменія, якая прадстаўляе сваю тэматычную экспазіцыю, прысвечаную 500-годдзю армянскага кнігадрукавання.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Амерыка Дыяс Нуньес таксама прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця XIX Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу. Пасол падзякаваў міністру за магчымасць прыняць удзел у выставе ў якасці ганаровага госця і прэзентаваў кнігу-фотаальбом з краявідамі Венесуэлы. Выданне, над якім працавалі і беларускія перакладчыкі, убачыла свет у студзені 2012-га.

Зразумела, усю ўвагу арганізатары скіравалі на рэкламу кніжнай прадукцыі, папулярызацыю творчасці беларускіх пісьменнікаў і агульных чалавечых каштоўнасцей. На выставе прадстаўлена прадукцыя кнігавыдаўцоў з 20 краін свету — Азербайджана, Арменіі, Венесуэлы, Германіі, Індыі, Ірана, Італіі, Ізраіля, Казахстана, Кубы, Малдовы, Расіі, Славакіі, ЗША, Таджыкістана, Туркменістана, Украіны, Францыі, Швецыі інш. Агульная колькасць экспанентаў — больш за 600.

У якасці ганаровага госця, разам з Расіяй, Украінай, Ізраілем, Казахстанам, Францыяй і Германіяй, гэтым разам выступае і Венесуэла. На мінскі кніжны кірмаш завітаў нават венесуэльскі пісьменнік Луіс Брыта Гарсія. Увогуле, аматараў кнігі чакае шмат сустрэч з вядомымі аўтарамі і як мінімум столькі ж аўтограф-сесій.



Міністр інфармацыі Беларусі Алег Праляскоўскі, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр Радзькоў і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Беларусі Амерыка Дыяс Нуньес каля венсуэльскага стэнда.

Як заўжды, шырока прадстаўлена Расія — каля 50 выдавецтваў. Дарэчы, па традыцыі лепшыя кнігі сваіх экспазіцый расійскія выдаўцы падораць чытачам: у дзень закрыцця выставы кнігі-экспанаты будуць перададзены прадстаўнікам Міністэрства інфармацыі Беларусі, а пасля трапяць і ў фонды бібліятэк.

Акрамя таго, наведвальнікі выставы змогуць убачыць у поўным аб'ёме ўсё, што было выпушчана дзяржвыдавецтвамі ў 2011-м і на пачатку бягучага года, а таксама пазнаёміцца з многімі замежнымі выданнямі, якія не прадстаўлены ў кніжных магазінах і адсутнічаюць у фондах бібліятэк. Паўдзельнічаць у прэзентацыі кніг і набыць штосьці для ўласнай бібліятэкі, сустрэцца з кнігавыдаўцамі, мастакамі, паўдзельнічаць у семінарах і «круглых сталах», акцыях. І ўсё ў імя Яе вялікасці кнігі.

**Галіна ГРЫЦКЕВІЧ,**
**Таццяна РУСАКОВІЧ.**